Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!



# ЗА ЛЕНІНСКІЯ КАДРЫ

Орган парткома і профкома Беларускага Дзяржаўнага Універсітэта

№ 6 3 кастрычніка 1935 г. № 6

## Горача вітаем пастанову СНК СССР і ЦК ВКП(б)

З велізарным задавальненнем і вялікай радасцю сустрэлі студэнты БДУ пастанову партыі і ўрада аб зніжэнні цэн на хлеб і адмене картачнай сістэмы.

На адбыўшыхся сходах па інтэрнатах 29-га верасня, студэнты горача віталі і дзякавалі партыю і ўрад за бацькоўскія клопаты аб паляпшэнні ўмоў жыцця ўсіх працоўных нашай радзімы. Студэнты ў сваіх пастановах заяўлялі, што гэтыя штодзенныя клопаты партыі і ўрада, нашага вялікага правадыра тав. СТАЛІНА яшчэ больш абавязваюць і натхняюць нас працаваць лепш, падрыхтаваць з сябе высокаякасных спецыялістаў, патрэбных нашай радзіме.

# Праверкай партдакументаў— да канца ачысцім нашы рады ад усіх ворагаў партыі

## СУР'ЁЗНАЕ ПАПЯРЭДЖАННЕ

*Рашэнне ЦК ВКП(б) аб праверцы партдакументаў з'яўляецца адным з галоўнейшых мерапрыемстваў па рэалізацыі пастаноў XVII з'езда партыі і ўказанняў таварыша СТАЛІНА аб падцягванні арганізацыйнага кіраўніцтва да ўзроўня палітычнага. Праверка партдакументаў павінна выкрыць, разаблачыць апартуністаў, чужакоў і аферыстаў, якія зацясаліся ў рады нашай партыі.*

*Выкрыць чужакоў і прахадзімцаў немагчыма без самага крапатлівага вывучэння ўсіх звенняў работы партыйнай арганізацыі, без вывучэння жывых людзей, без самай вострай большэвіцкай пільнасці да нашых ворагаў.*

*Пастановай Менгаркома КП(б)Б адменена правядзеная праверка партдакументаў у нашай партарганізацыі і назначана паўторная праверка.*

*Адмена праверкі партдакументаў—сур'ёзнае папярэджанне нашай партарганізацыі. Гэты факт сведчыць аб тым, што партарганізацыя аднеслася да гэтага вельмі важнага палітычнага пытання не з большэвіцкай пільнасцю. Дрэнна была праведзена падрыхтоўчая работа. Зусім недастаткова было прапрацавана на сходзе пытанне аб праверцы партдакументаў і дастойнасці данага члена або кандыдата партыі насіць білет нашай вялікай большэвіцкай партыі.*

*Адмена праверкі партдакументаў у нашай партарганізацыі яшчэ раз сведчыць аб недастатковай большэвіцкай самакрытыкі і пільнасці, якая павінна быць арганічнай уласцівасцю кожнага большэвіка. Аб гэтым сведчаць такія факты, як выключэнне з радоў нашай партыйнай арганізацыі Нікалаені М. Ф. і Амбросава.*

*Паўторная праверка партдакументаў павінна яшчэ больш адтачыць большэвіцкую пільнасць кожнага члена нашай арганізацыі.*

*Праверка партдакументаў павінна выявіць не толькі патрэбы нашай арганізацыі, але і патрэбы кожнага комуніста паасобку і гэтым самым мы карэнным чынам палепшым нашу партыйную работу.*

*Праводзячы праверку, вывучаючы нашы партыйныя кадры, мы зможам зрабіць перастаноўку партыйных сіл і высунуць на адказныя работы тых таварышоў, якія здольны выконваць гэту работу.*

*У часе паўторнай праверкі партдакументаў, зорка прыглядаючыся да кожнага комуніста, ачышчаючы нашу арганізацыю ад варожых элементаў, выкрываючы слабыя месцы кожнага комуніста, мы даб'емся яшчэ большага ўмацавання нашай партыйнай арганізацыі, згуртавання яе вакол ленінскага ЦК і яе правадыра тав. Сталіна.*

## Апраўдаць званне парттысячніка

На факультэтах БДУ 45 комуністаў—парттысячнікаў—пасланых партыяй на вучобу, як на адзін з адказнейшых участкаў. Асноўная маса парттысячнікаў сваёй вучобай, партыйнай і грамадскай работай, апраўдваюць давер'е партыі, ведучы за сабой беспартыйных студэнтаў.

Парттысячнік **Камінскі** працуе старшынёй прафкома, з работай спраўляецца і вучыцца на „добра". Парттысячнік Адзінец—нам. сакратара парткома БДУ—таксама не адстае ў вучобе. Парттысячнікі **Малюкевіч**, **Маханёк**—„атлічнікі вучобы", актыўна ўдзельнічаюць у грамадскай рабоце універсітэта. Парттысячнікі Шыфрына, Гузей, Цоір, Юшпэ, Грыф, Поляк, Перапецкі, Акімава і др.—гэта наш актыў.

З 45 чалавек парттысячнікаў ёсць і такія, якія не апраўдваюць гэтага высокага звання студэнта-парттысячніка. Яны забыліся, што партыя ад іх патрабуе добра авалодваць тэхнікай сваёй справы, у нашых умовах—гэта добра вучыцца, актыўна ўдзельнічаць у палітычным жыцці, павышаць свой ідэйны ўзровень, працаваць над асваеннем асноў марксізма-ленінізма, знаць важнейшыя палітычныя і арганізацыйныя рашэнні партыі і растлумачваць іх беспартыйным.

**Бернштэйн, Бабчонак, Церашэнка**—парттысячнікі, у вучобе апошнія, ад актыўнай грамадскай работы адмахваюцца. Марксісцка-ленінская падрыхтоўка ў іх нізкая. Або, напрыклад, **Бірылка**, калі ёй даюць грамадскую работу, то яна кідае вучобу і адстае ў знак пратэсту —„не спраўляюся" па-простаму гаворачы —сімулірує, а такія паводзіны недастойны комуніста.

Акрамя адмоўнага больш няма чаго сказаць і аб парттысячніках Капенгуд Ц. і Дзягель. Гэтыя парттысячнікі не адчуваюцца як комуністы ў асяроддзі студэнцтва.

На геафаке ёсць парттысячнік **Зміцер**, які зусім адарваўся ад партарганізацыі, у асабовым жыцці пайшоў па шляху разлажэння. Там-жа на геафаке яшчэ лічыцца парттысячнікам даўно выключаны з партыі **Амбросаў**, які падрабіў партстаж, прысвоіў 13-ці гадовы рабочы стаж, які, правучыўшыся 3 гады на факультэце—рэдка калі да канца праслухваў лекцыі, ніколі не рыхтаваўся да занятак, палітычна няграматны, а хвастаючыся сваімі заслугамі толькі п'янстваваў.

Асобна трэба адзначыць паводзіны парттысячніка **Арашкевіча**—члена парткома, які ніколі не бывае ў масе студэнтаў і нават не ўсе студэнты-комуністы ведаюць яго. Арашкевіч амаль ніколі не выступае на партсходах. У інтэрнаце ў яго тэндэнцыя не арганізоўваць студэнтаў, а раз'яднаць іх, пасварыць паміж сабой. Калі да яго звяртаюцца за дапамогай, то ён адмаўляецца.

Есць парттысячнікі, якія, хлваючыся за спіну другіх, зусім не цікавяцца чым жыве партарганізацыя, чым жыве факультэт, чым жыве ўніверсітэт (Скібарка Шкарубскі, Пазнякоў, Ротман, Мільман і Бірульчык).

Тыя комуністы, якія ўспамінаюць, што яны парттысячнікі толькі пры атрыманні стыпендыі, не павінны быць у ліку парттысячнікаў, аб іх патрэбна ставіць вельмі востра пытанне, як аб комуністах.

Студэнт, асабліва комуніст, павінен быць не толькі перадавіком у вучобе, але і ў грамадскай рабоце.

**Ф. Асоўскі і Р.**

## Твар „комуніста" Нікалаені

Факты, ускрытыя партарганізацыяй БДУ, зусім яскрава даказваюць правільнасць рашэння гарадскога камітэта партыі аб адмене праверкі партыйных дакументаў у нашай партарганізацыі. Паўторная прапрацоўка гэтага пытання паказала, што падрыхтоўчая работа да праверкі партдакументаў была праведзена дрэнна, праверка фактычна з'явілася тэхнічна-канцэлярскай зверкай правільнасці запісаў і ўстанаўленне дат. Патарганізацыяй не былі выкрыты класава-варожыя элементы, хаваючыяся за партбілетам.

Вось факты. **Нікалаеня М. Ф.**, член КП(б)Б з 1929 г., у Копыльскай арганізацыі ён атрымаў ад райкома КП(б)Б суровую вымову за сувязь з кулацтвам, У 1931 г. ён выключаецца з партыі за праваапартуністычнае кіраўніцтва ячэйкай і сельсоветам, за не рэагаванне на недавядзенне цвёрдых заданняў кулацка-заможным гаспадаркам, за выступленне супроць рэальнасці планаў даведзеных да сельсовета, за прысваенне кулацкай маемасці (адзеяла і гадзінніка).

Зараз Нікалаеня студэнт БДУ. Але тут праяўляе сябе, як абывацель. Ён пачынае спекуляваць салам сярод студэнтаў. На чыстцы партыі ў 1933 г, яго за абсалютную палітычную непісьменнасць, правал работы і наогул непадрыхтаванасць быць членам партыі—пераводзяць у кандыдаты, аднак Нікалаеня не робіць для сябе адпаведных вывадаў, а шукае месца, дзе-б можна было шляхам ашуканства нажыцца. Ён прэбіраецца ў каменданты баракаў. Закупаючы розныя рэчы для інтэрнатаў, Нікалаеня не мог, безумоўна, заставіць сябе ў крыўдзе, ён прысвайвае дзесяткі метраў мануфактуры і мягкую мебель. І нарэшце, працуючы на рамонце інтэрната, ён прапанаваў студэнтам падпісаць фіктыўны рахунак за работу, якой яны зусім не рабілі, абяцаючы ім палову грошай, што безумоўна яны не зрабілі, а выкрылі жуліка.

Да партвучобы Нікалаеня адносіцца пагардліва, па мяшчанску, гаворачы, што мне няма часу вучыцца, ды і я так многа ведаю.

Пры праверцы партдакументаў Нікалаеня амаль усе скрыў ад парткома і камісіі. І толькі зараз усё гэта выкрыта.

**К-В.**

## Высокаякасна арганізаваць партпалітвучобу

Наша партыя заўсёды ўдзяляла вялікую ўвагу партыйнай вучобе. І зараз, калі мы стаім на парозе пабудовы бяскласавага соцыялістычнага грамадства, калі мы перамагаем „перажыткі капіталізма не толькі ў эканоміцы, але і ў свядомасці людзей", вывучаць тэорыю марксізма-ленінізма. гісторыю нашай партыі патрэбна кожнаму комуністу, комсамольцу і беспартыйнаму. Без гэтых ведаў немагчыма быць на чале мас, якія будуюць соцыялізм.

XVII партз'езд у прынятым статуце партыі, абавязвае кожнага комуніста „бесперапынна працаваць над павышэннем сваёй ідэйнай узброенасці, над уразуменнем асноў марксізма-ленінізма, важнейшых палітычных і арганізацыйных пастаноў партыі і растлумачваць іх беспартыйным масам".

Наша партарганізацыя — вузаўская, састаіць у большасці з маладых членаў і кандыдатаў партыі і адсюль правільная арганізацыя партыйнай вучобы набывае асаблівае значэнне. Партыйны камітэт БДУ рашыў арганізаваць тры тыпы партшкол: кандыдацкую школу, два гурткі па вывучэнню гісторыі партыі і гурток па вывучэнню асобных твораў класікаў марксізма.

Усе члены партыі, кандыдаты і спачуваючыя ахоплены партыйнай вучобай. Арганізавана 13 комсамольскіх гурткоў па вывучэнню гісторыі партыі і 2 гурткі па вывучэнню асобных твораў класікаў марксізма. Таксама арганізаваны 21 тэматычны гурток і адзін гурток па вывучэнню твораў класікаў марксізма, дзе будуць вучыцца беспартыйныя студэнты. Акрамя гэтага, арганізаваны гурткі для навуковых работнікаў, тэхнічнага персанала і адначасова будуць працаваць тры семінары для прапагандыстаў.

Цяпер галоўнае састаіць у тым, каб добра і правільна арганізаваць семінар прапагандыстаў і штодзённа дапамагаць у іх рабоце.

Паспяховае правядзенне партпалітвучобы залежыць, галоўным чынам, ад прапагандыста. Работа прапагандыста вялікая і адказная, патрабуючая вялікіх ведаў, ідэалагічнай вытрыманасці і добрасумленных адносін да справы.

**С. Адзінец.**

